# АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ Ў 50–60-Я ГАДЫ XX ст.

*Л. А. Козік*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, Kozik@bsu.by*

У артыкуле вылучаюцца такія асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў Польшчы, як мілітарызацыя эканомікі, адсутнасць дастатковых уласных інвестыцый і рост знешняй запазычаснасці ў канцы 1960-х гг., тэхналагічнае адставанне, экстэнсіўнае развіццё, абмежаванасць рынкаў збыта, спецыялізацыя на пастаўках сыравіны ў межах Савета эканамічнай узаемадапамогі, цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва спажывецкімі таварамі. Для ПНР канца 1960-х гг. характэрна такая з'ява, як «недаўрбанізацыя».

***Ключавыя словы:*** Польшча; індустрыялізацыя; планавая эканоміка; урбанізацыя.

# FEATURES OF INDUSTRIALIZATION IN POLAND IN THE 50S AND 60S OF THE XX CENTURY

***L. A. Kozik***

*Belarusian State University,*
*Niezaležnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, Kozik@bsu.by*

Such features of industrialization in Poland as the militarization of the economy, the lack of sufficient investments and the growth of foreign debt in the late 1960s, technological lag, extensive development of the economy, limited sales markets, specialization in the supply of raw materials within the framework of the Council of Mutual Economic Assistance, difficulties in providing the population with consumer goods are highlighted in the article. Such a phenomenon as «under-urbanization» is characteristic for the People's Republic of Poland of the late 1960s.

***Keywords:*** Poland; industrialization; planned economy; urbanization.

У канцы Другой сусветнай вайны Польшча трапіла ў сферу ўплыву СССР, што перадвызначыла яе далейшае развіццё. Калі ў першыя пасляваенныя гады камуністы, якія прыйшлі да ўлады, заяўлялі аб існаванні «польскага шляху да сацыялізму», то ўжо ў 1948 г. яны ўзялі курс на пабудову сацыялізму па савецкім узоры. У эканамічнай сферы гэта прадугледжвала у тым ліку правядзенне індустрыялізацыі краіны.

Пачынаючы з 1944 г. у руках дзяржавы канцэнтравалася ўсё больш прамысловых прадпрыемстваў. Рэалізацыя закона аб нацыяналізацыі (1946) прывяла да дамінавання дзяржаўнага сектара ў экономіцы краіны. Толькі ў прамысловасці ў 1948 г. было занятка каля 88 % ад агульнай колькасці рабочых [1, p. 22]. Такая сітуацыя прывяла да канцэнтрацыі ў руках дзяржавы асноўных фінансавых сродкаў, што стварала ўмовы для правядзення індустрыялізацыі.

Распрацоўка ў 1948 г. інвестыцыйнага плана стала першым крокам да правядзення індустрыялізацыі ў Польшчы. Было відавочна, што ўнутраных рэсурсаў на развіццё прамысловага сектара не хапае, а таму польскае кіраўніцтва пачало шукаць магчымасці для атрымання знешніх крэдытаў. У тым жа 1948 г. яно заключыла дамову з СССР, якая прадугледжвала выдзяленне Польшчы крэдыта памерам 450 млн долараў і пастаўкі інвестыцыйнага абсталявання ў 1948–1956 гг. [2, p. 198–199]. Дадатковыя сродкі дзяржава атрымала ад праведзенай у 1950 г. валютнай рэформы, а таксама за кошт увядзення ўнутранай пазыкі (якая фактычна насіла прымусовы характар) і рэжыма эканоміі [3, p. 240].

Пабудова сацыялізму прадугледжвала існаванне планавай эканомікі. Першыя спробы пераходу да яе назіраліся яшчэ ў 1947 г., аднак стварэнне ў красавіку 1949 г. Дзяржаўнай камісіі планавання гаспадаркі замацавала дадзеную тэндэнцыю. У кампетэнцыю новага інстытута, які стаяў вышэй за гаспадарчыя міністэрствы, уваходзіла планаванне на макраўзроўні, справаздачы, баланс і падзел тавараў, справы тэрытарыяльнага размеркавання вытворчасці ў краіне, усталяванне коштаў і тарыфаў, палітыка у дачыненні да прыватнага сектара, вынаходніцтвы і інш. [1, p. 46–47; 4, p. 41–42].

Механізм правядзення індустрыялізацыі быў апісаны ў 6-гадовым плане развіцця краіны на 1950–1955 гг. У ім сярод найбольш важных задач было вызначана развіццё такіх галін сацыялістычнай прамысловасці, як металургічная, машынабудаўнічая і хімічная, а таксама адзначалася неабходнасць забеспячэння патрэбаў насельніцтва ў спажывецкіх таварах. Прадугледжвалася, што дзякуючы хуткаму росту прадукцыі сродкаў вытворчасці ў 1955 г. рост прамысловай прадукцыі будзе складаць 158 % ад узроўня 1949 г. Адзначасова з гэтым планаваўся рост прадукцыйнасці працы на 66 % і зніжэнне коштаў на ўласную прадукцыю на 17 % пры значным павышэнні якасці тавараў. Аўтары адзначалі, што дасягненне такіх паказчыкаў стане магчымым дзякуючы намаганням усяго народа, а таксама выяўленню і выкарыстанню ўсіх магчымых рэзерваў народнай гаспадаркі [5, p. 253–259].

Заўважым, што ва ўмовах «халоднай вайны» планавыя паказчыкі неаднаразова карэктаваліся, что тлумачылася неабходнасцю пасілення абароназдольнасці краіны. Як следства, адбывалася пераразмеркаванне інвестыцыйных сродкаў на карысць развіцця цяжкай прамысловасці, якая забяспечвала патрэбы ваенна-прамысловага комплекса.

Пад час рэалізацыі 6-гадовага плана польскія ўлады сутыкнуліся з недахопам сыравіны і паліва, энергетычнымі праблемамі, нязначным выкарыстаннем новых тэхналогій (у тым ліку па прычыне недахопу кваліфікаваных кадраў), нізкай прадукцыйнасцю працы і якасцю прадукцыі, малым асартыментам тавараў. Негатыўнымі фактарамі ў правядзенні індустрыялізацыі выступалі абмежаваны доступ да новых тэхналогій (Польшча магла разлічваць толькі на савецкія тэхналогіі), развіццё эканамічных сувязей пераважна ў межах Савета эканамічнай ўзаемадапамогі (СЭУ), перагляд пад уплывам міжнароднай сітуацыі планавых паказчыкаў на карысць развіцця цяжкай прамысловасці. Не давалі чакаемага выніку і спробы павысіць прадукцыйнасць працы на энтузіазме рабочых. У іх асяроддзі ідэі сацспаборніцтва і стаханаўскага руху не знаходзілі масавай падтрымкі [1, p. 61–65, 77; 6, p. 90–91].

Будаўніцтва новых прадпрыемстваў патрабавала павелічэння колькасці занятых як у непасрэдным будаўніцтве, так і арганізацыі вытворчасці. Ужо да сярэдзіны 1950-х гг. у Польшчы было ўзведзена звыш 100 прадпрыемстваў, на якіх былі занятыя 150 тысяч чалавек. Усяго за перыяд з 1949 па 1955 г. колькасць занятых у прамысловасці вырасла з 1,8 млн да 2,8 млн чалавек, то бок рост склаў 41 %. Шэрагі пралетарыята папаўнялі пераважна сельскія жыхары, моладзь, жанчыны, якія выконвалі нізкакваліфікаваныя работы, нязначная частка гарадской і сельскай буржуазіі [7, p. 113; 8, с. 25; 9, с. 42].

Рэалізацыя 6-гадовага плана суправаджалася недахопамі ў арганізацыі і ўмовах працы рабочых, яе аплаце (адбывалася сталае павышэнне нормаў выпрацоўкі прадукцыі пры захаванні існуючага заробку, ці пры яго нязначным росце) [6, p. 89, 94]. На шэрагу прадпрыемстваўназіралася празмерная колькасць рабочых, у той час як на іншых іх не хапала, існавалі праблемы з працоўнай дысцыплінай. Распаўсюджанай з'явай было парушэнне працоўнага заканадаўства: рабочыя працавалі больш за 8 гадзін, каб выканаць планавыя паказчыкі ці зарабіць больш грошай. Прычыны такой сітуацыі, на думку даследчыкаў, заключаліся ў невыгаднай геаграфіі будаўніцтва новых фабрык і заводаў, нераўнамерным размяшчэнні вытворчасці, слабым узаемадзеянні звязаных вытворчым працэсам прадпрыемстваў, адсутнасці ў іх кіраўніцтва самастойнасці ў прыняцці рашэнняў [3, p. 247; 10, p. 68].

Ва ўмовах пастаяннага павелічэння інвестыцый ў цяжкую прамысловасць за кошт сельскай гаспадаркі і вытворчасці спажывецкіх тавараў, заняпада прыватнай вытворчасці і мястэчак нарасталі праблемы ў

забеспячэнні насельніцтва прадуктамі і спажывецкімі таварамі, што выклікала незадаволенасць у грамадстве. Ужо ў 1953 г. выразна праявілася дыспрапорцыя ў развіцці польскай эканомікі, назіралася зніжэнне эфектыўнасці вытворчасці, недахоп спажывецкіх тавараў і іх нізкая якасць, слабае забеспячэнне сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасці, нязначны рост заробкаў. Склаўшаяся сітуацыя абмяркоўвалася на IX пленуме ЦК ПАРП (кастрычнік 1953 г.) і II з'ездзе ПАРП (сакавік 1954 г.), рашэнні якіх ляглі ў аснову праграмы паляпшэння эканамічнай сітуацыі ў краіне. У 1955–1956 гг. пры захаванні ўстаноўкі на развіццё цяжкай прамысловасці кіраўніцтва краіны зрабіла стаўку на падтрымку вытворчасці спажывецкіх тавараў, спадзеючыся такім чынам рэалізаваць задачу па паляпшэнні ўмоў жыцця насельніцтва [1, р. 87–88]. Аднак рабочыя выступленні летам 1956 г. у Познані выявілі, што прынятых мер было недастаткова.

Грамадска-палітычны крызіс 1956 г. паказаў неабходнасць вырашэння праблемы забеспячэння спажывецкімі таварамі і паляпшэння ўмоў жыцця насельніцтва, ліквідацыі дыспрапорцый у эканоміцы. Менавіта на гэта была зроблена стаўка пры распрацоўцы 5-гадовага плана развіцця на 1956–1960 гг. Першыя два гады яго рэалізацыі паказалі запавольванне тэмпаў росту гаспадаркі і ВУП, змены эканамічных прапорцый і адначасовы рост узроўня жыцця насельніцтва і спажывання. Пры гэтым рост вытворчасці спажывецкіх тавараў склаў 55 %, а цяжкай прамысловасці – 64 % (у параўнанні з 6-гадовым планам гэты паказчык выглядаў вельмі сціпла) [11, р. 186, 188–193].

Адыход ад палітычных рэформ у 1957 г. адзначыўся і адмовай ад эканамічных рэформ [3, р. 261–262]. У маі 1957 г. генеральны сакратар ЦК ПАРП У. Гамулка заявіў пра заканчэнне перыяда прэферэнцый для інвестыцый ў спажыванне і вяртанне да паскоранай індустрыялізацыі краіны. У якасці прыярытэтных задач у гэты час было вызначана развіццё сыравіннай базы, паліўна-энэргетычнай сферы, металаапрацоўчай і хімічнай прамысловасці, машынабудавання, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў [12, р. 44]. Для мінімалізацыі праблем з забеспячэннем вытворчасці электрычнасцю ўлады зрабілі стаўку на павелічэнне здабычы каменнага вугля шляхам адкрыцця новых шахтаў, а таксама выкарыстанне нафты (у 1958 г. у межах СЭУ было прынята рашэнне аб будаўніцтве нафтапровада «Дружба», які павінен быў забяспечыць краіны Цэнтральнай Еўропы савецкай нафтай) і газу (пачаўся пошук радовішчаў).

Далейшае правядзенне паскоранай індустрыялізацыі патрабавала значных інвестыцыйных сродкаў, якіх у Польшчы не было. Часткова гэтая

праблема вырашалася за кошт крэдытаў з боку СССР, ЗША, Канады, Францыі і ГДР. Капіталістычныя краіны былі зацікаўлены ў пастаўках збожжа, тлушчу і іншых тавараў з Польшчы, а таму ахвотна пазычалі ёй грошы [3, p. 269–270].

Праблему пошукаў сродкаў на правядзенне індустрыялізацыі мог часткова вырашыць рост экспарта тавараў. Аднак асноўныя рынкі збыту польскай прадукцыі прыходзіліся на краіны-члены СЭУ і краіны трэцяга свету. Разам з тым, у межах склаўшайся ў СЭУ спецыялізацыі за ПНР была замацавана роля пастаўшчыка сыравіны, што не давала высокіх паступленняў у бюджэт [3, p. 276]. Спробы польскіх улад прыцягнуць інвестыцыі суседніх сацыялістычных дзяржаў у распрацоўку радовішчаў ці будаўніцтва перапрацоўчых прадпрыемстваў на тэрыторыі Польшчы не давалі жадаемага выніку. Адмоўным фактарам у правядзенні індустрыялізацыі сталі і неўраджаі 1959 і 1962 гг., калі Польшча была вымушана імпартаваць збожжа.

Што тычыцца гандлёвых сувязей з заходнімі краінамі, то ў 1960-я гг. ПНР па-ранейшаму прадавала ім пераважна сыравіну, бо яе тавары былі неканкурэнтаздольнымі (іх якасць не задавальняла нават унутраных спажыўцоў). Спробы польскіх улад палепшыць якасць і пашырыць асартымент прадукцыі шляхам закупкі ліцэнзій на Захадзе не прывялі да павелічэння экспарту тавараў і зменаў у гандлёвым сальда. Зваротным бокам такой палітыкі стала нарастанне ў канцы 1960-х гг. знешняй запазычанасці ПНР [12, p. 45–46].

Дадатковай праблемай у 1960-я гг. стала неабходнасць працаўладкавання вялікай колькасці маладых людзей, якія нарадзіліся пасля вайны. Гаворка ідзе пра 2,5 млн чалавек (1 млн у 1960–1965 і 1,5 млн ў 1966–1970 гг.) [13, p. 44]. Існуючыя прадпрыемствы не маглі прыняць такую колькасць працаздольнага насельніцтва, таму польскія ўлады пайшлі па шляху будаўніцтва прамысловых аб’ектаў. Пры гэтым у краіне існавала неабходнасць мадэрнізацыі існуючых прадпрыемствуў, у тым ліку па прычыне іх нізкай рэнтабельнасці. Толькі да канца 1964 г. у Польшчы было пабудавана 500 новых прадпрыемстваў, а ў 700 існуючых адкрыліся новыя вытворчыя цэхі. У цэлым разбудова, рэканструкцыя і мадэрнізацыя закранула каля 2 тысяч прадпрыемстваў [11, p. 178]. Аднак ва ўмовах планавай эканомікі і камандна-размеркавальнай сістэмы мадэрнізацыя не дала чакаемых вынікаў. Такім чынам, у канцы 1960-х гг. экстэнсіўнае развіццё прамысловасці стала відавочным фактам.

Адсутнасць структурных рэформ непазбежна вяла да нарастання эканамічных праблем. Яны праяўляліся ў недахопе спажывецкіх тавараў, іх нізкай якасці, высокіх коштах тавараў пры нязначным росце зарплат і інш. Спробы ўладаў стымуляваць прадукцыйнасць працы не знайшлі падтрымкі сярод рабочых. Ва ўмовах нарастання знешняй запазычанасці і недахопу валюты кіраўніцтва ПНР дазволіла сваім грамадзянам адкрываць валютныя рахункі (з 1950 г. існавала забарона на іх існаванне), але гэта не стала вырашэннем праблемы ва ўмовах зніжэння ўзроўня жыцця насельніцтва. Больш за тое, неўраджай бульбы ў канцы 1960-х гг. прывёў да рэзкага зніжэння пагалоўя жывёлін, што выклікала праблемы ў забеспячэнні насельніцтва прадуктамі жывёлагадоўлі. На гэтым фоне прынятае ў снежні 1970 г. рашэнне аб павышэнні коштаў на прадукты і тавары народнага спажывання прывяло да выступленняў рабочых.

Падводзячы выснову, адзначым, што індустрыялізацыя ў Польшчы ў 1950-я – 1960-я гг. характарызавалася перш за ўсё мілітарызацыяй эканомікі. Найбольш развітымі і мадэрнізаванымі былі тыя галіны вытворчасці, якія абслугоўвалі развіццё ваенна-прамысловага комплекса краіны. Гэта датычылася вытворчасці сыравіны, энэргетычнай галіны, хімічнай вытворчасці і машынабудавання. У цэлым развіццё прамысловасці насіла экстэнсіўны характар. Абмежаванасць уласных інвестыцый вымагала шукаць знешнія крыніцы фінансавання, перш за ўсё ў СССР. У цэлым эканоміка Польшчы была цесна звязана з развіццём гаспадарчых сувязей з краінамі сацлагера. Адносіны ў межах СЭУ мелі для ПНР як станоўныя моманты (гарантаваныя рынкі збыта), так і адмоўныя – за краінай фактычна замацавалася роля пастаўшчыка сыравіны.

Мадэрнізацыя тэхналагічнага працэса шляхам закупкі заходніх ліцэнзій дазволіла часткова задаволіць патрэбы ўнутранага спажыўца, аднак не дазволіла польскім таварам выйсці на міжнародныя рынкі. Адмоўнае гандлёвае сальда вяло да нарастання знешняй запазычанасці Польшчы ў канцы 1960-х гг. Плануючы правядзенне індустрыялізацыі, кіраўніцтва Польшчы разлічвала на паляпшэнне ўзроўня жыцця насельніцтва. Аднак рабочыя выступленні 1956 і 1970 гг. паказалі, што чаканні людзей разыходзіліся з рэальнасцю і тым грамадствам дабрабыту, пра якое гаварыла прапаганда. Адсутнасць дастатковых фінансавых сродкаў у сукупнасці з экстэнсіўным шляхам развіцця прывялі ў Польшчы канца 1960-х гг. да такой з’явы, як «недаўрбанізацыя».

**Бібліяграфічны спіс**


1. Kaliński J. Polityka gospodarcza Polski w latach 1948–1956. Warszawa: Książka i Wiedza, 1987.
2. Skrzypek A. Mechanizmy uzależnienia. Stosunki polsko-radzieckie 1944–1957. Pułtusk: ASPRA–JR, 2002.
3. Kaliński J., Landau Z. Gospodarka Polski w XX wieku. Warszawa: Polskie Wydawnictwo Ekonomiczne, 2003.
4. Kaliński J. «Transformacja» do gospodarki centralnie planowanej w Polsce (1944–1950) // Optimum. Studia ekonomiczne. 2019, nr 1 (95). P. 32–45. URL: https://repozytorium. uwb. edu. pl/jspui/bitstream/11320/7552/1/Optimum_1_2019_J_Kalinski_Transformacja_do_gospodarki. pdf (Дата звароту: 29. 08. 2022). DOI: 10. 15290/oes. 2019. 01. 95. 03
5. Źródła do dziejów Polski w XIX i XX wieku. Tom V: Lata 1945–1956 / Wybór tekstów źródłwych: A. Koseski, J. R. Szaflik, R. Turkowski. Pułtusk: Wyższa Szkoła Humanistyczna im. Aleksandra Gieysztora, 2003.
6. Kaliński J. Ekonomiczne aspekty kryzysów system komunistycznego w Polsce (1956–1980) // Pamięć i Sprawiedliwość. 2007, Nr 6/1 (11). P. 89–104. URL: https://bazhum. muzhp. pl/media/files/Pamiec_i_Sprawiedliwosc/Pamiec_i_Sprawiedliwosc-r2007-t6-n1_(11)/Pamiec_i_Sprawiedliwosc-r2007-t6-n1_(11)-s89-104/Pamiec_i_Sprawiedliwosc-r2007-t6-n1_(11)-s89-104. pdf (Дата звароту: 10. 09. 2022).
7. Karpiński A. Zagadnienia socjalistycznej industrializacji Polski. Warszawa: Polskie Wydawnictwa Gospodarcze, 1958.
8. Польша в цифрах, 1944–1961 / Центральное статистическое управление Польской Народной Республики. Варшава, 1962.
9. Лойко Л. В. Рост рядов польского рабочего класса в годы социалистической индустриализации страны (1950–1960) // Советское славяноведение. 1974, № 5. С. 35–47.
10. Kochanowski J. «Niepotrzebni muszą odejść», czyli widmo bezrobocia 1956–1957 // Polska 1944/1945–1989. Studia i materiały. 2016, XIV. P. 61–97. DOI: 10. 12775/Polska. 2016. 03
11. Smoliński S., Boroń J. Główne kierunki industrializacji w Polsce Ludowej // Ruch prawniczy, ekonomiczny I socjologiczny. 1964, nr 4. P. 175–195. URL: https://repozytorium. amu. edu. pl/handle/10593/18788 (Дата звароту: 14. 08. 2022)
12. Kaliński J. Gomułkowskie dylematy modernizacji gospodarki // Annales Universitatis Paedagogical Cracoviensis. Studia Politologica. 2011, tom V. P. 41–50. URL: https://bazhum. muzhp. pl/media//files/Annales_Universitatis_Paedagogicae_Cracoviensis_Studia_Politologica/Annales_Universitatis_Paedagogicae_Cracoviensis_Studia_Politologica-r2011-t5/Annales_Universitatis_Paedagogicae_Cracoviensis_Studia_Politologica-r2011-t5-s41-50/Annales_Universitatis_Paedagogicae_Cracoviensis_Studia_Politologica-r2011-t5-s41-50. pdf (Дата звароту: 29. 08. 2022)